УДК 340.113.2

# ДАКУМЕНТ ЯК ТЭКСТ ЮРЫДЫЧНАЙ ТЭМАТЫКІ Ў ПРАВААХОЎНАЙ ПРАКТЫЦЫ

*У. І. Сокал,*
*курсант факультэта міліцыі Магілёўскага інстытута МУС*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

У юрыдычнай моўнай практыцы органаў унутраных спраў (ОУС) галоўнае месца займае афіцыйна-справавы стыль, сферай выкарыстання якога з’яўляецца афіцыйная службовая перапіска з падраздзяленнямі і грамадзянамі, а таксама грамадзянскімі ўстановамі. У найбольш агульным сэнсе ўсе тэксты юрыдычнай тэматыкі ў праваахоўнай практыцы адносяцца да разраду дакументаў. Дакумент — гэта сродак замацавання разнастайнымі спосабамі інфармацыі пра факты, падзеі, з’явы аб’ектыўнай рэчаіснасці і разумовай дзейнасці чалавека.

Сярод распарадчых дакументаў у практыцы ОУС вылучаюцца: 1) пастанаўленне — прававы акт, які прымаецца вышэйшымі органамі кіравання з мэтай вырашэння найбольш важных задач і ўсталявання стабільных нормаў і правілаў; 2) рашэнне — прававы акт, які прымаецца калегіяльным органам; 3) распараджэнне — акт кіравання, які мае ўладны характар і абавязковую сілу для грамадзян і ўстаноў, якім адрасавана; 4) загад — акт, выдадзены кіраўнікамі міністэрстваў, устаноў адукацыі сістэмы МУС і тэрытарыяльных органаў [1].

Распраўсюджанымі ў дзейнасці праваахоўных структур з’ўляюцца арганізацыйныя дакументы наступных відаў: 1) уставы (статуты) — зводы правіл, якія рэгулююць дзейнасць ОУС, правы і абавязкі ў пэўнай сферы кіравання ці аператыўнай дзейнасці; 2) палажэнні — нарматыўныя акты, якія вызначаюць парадак утварэння, структуру, функцыі, кампетэнцыю, абавязкі і арганізацыю работы ОУС; 3) інструкцыі — прававыя акты, якія выдаюцца з мэтай устанаўлення правіл, што рэгулююць арганізацыйныя пытанні і іншыя спецыяльныя бакі іх дзейнасці. Найбольшае распаўсюджванне ў штодзённай практыцы ОУС атрымалі рапарты як асаблівы від інфармацыйна-даведачных дакументаў. Рапарты адпавядаюць прынятым стандартам як з пункту гледжання логікі арганізацыі тэксту, стылю выкладання матэрыялу, так і з пазіцыі выканання патрабаванняў службовага этыкету.

Спецыфіка афіцыйна-справавога стылю і пашыранасць яго ўжывання ў практыцы органаў унутраных спраў абумоўліваюць неабходнасць развіцця моўнай кампетэнтнасці супрацоўнікаў. Асаблівае значэнне ў сувязі з гэтым набывае выкладанне дысцыплін “Беларуская мова (прафесійная лексіка)”, “Юрыдычная тэрміналогія” і “Рыторыка” ў навучальных установах сістэмы МУС Рэспублікі Беларусь.

**Список основных источников**

1. Венідзіктаў, С. В. Беларуская мова. Юрыдычная лексіка : вучэб. дапаможнік / С. В. Венідзіктаў, С. І. Даніленка. – Мінск : Изд-во Гревцова, 2013. – 152 с. Вернуться к статье